# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 11 клас
## Варыянт 1

### Заданне 1.

| *Складанае слова* | *Кампаненты вытворнага слова* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | ***1*** | ***2*** | ***3*** | ***4*** |
| *песняспеў* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **нулявы суфікс** |
| | кампанент | ***песн-(я)*** | ***-я-*** | ***спяв/а-(ць)*** | **ø** |
| *Усясвет* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **цэлае слова** | |
| | кампанент | ***ус-(ё)*** | ***-я-*** | ***свет*** | |
| *пустасейны* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **суфікс** |
| | кампанент | ***пуст-(ы)*** | ***-а-*** | ***сеj/а-(ць)*** | ***-н-*** |
| *зоркавокі* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **нулявы суфікс** |
| | кампанент | ***зорк-(і)*** | ***-а-*** | ***вок-(а)*** | **ø** |
| *зладюдны* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **суфікс** |
| | кампанент | ***зл-(ы)*** | ***-а-*** | ***людз-(і) / люд*** | ***-н-*** |
| *усясветны* | статус | **аснова** | **суфікс** | | |
| | кампанент | ***Усясвет-(ø)*** | ***-н-*** | | |

*За правільна вызначаны статус усіх кампанентаў у кожным слове – 0,5 бала, за правільна вызначаныя ўсе кампаненты ў кожным слове – 0,5 бала.*

### Заданне 2.

| *Фраг-мент* | *Колькасць мяккіх зычных* | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **2** | **3** | **4** | **5** |
| **1** | ***скідай<br>шумеці<br>кідай<br>ўвесь<br>сухацвет<br>сухавей*** | ***зялёная<br>размяці*** | ***расцвітай*** | ***песняспеваў*** |
| **2** | ***малюся<br>зямлі<br>ўсякай<br>ўсякую<br>Беларусі*** | ***Ўсясвету*** | | |
| **3** | ***цябе<br>полейка<br>клянеш*** | ***пустасейную*** | | ***неразвейнае<br>беззямельную*** |

*За бездакорнае выкананне ў межах аднаго фрагмента налічваюцца 2 балы. За кожную памылку рэкамендуецца здымаць па 0,5 бала ў межах фрагмента, але павінна атрымацца не менш за нуль балаў.*

**Заданне 3.**

| *Назва някроўнага сваяка* | *Магчымая фармулёўка значэння* |
|---|---|
| кум(ы) | Хросныя (духоўныя) маці і бацька ў адносінах да бацькоў хрэсніка |
| хроснік(і) | Хросны сын у адносінах да хросных бацькоў. |
| айчым | Няродны бацька; муж маці ў адносінах да яе дзяцей ад папярэдняга шлюбу |
| мачаха | Няродная маці; жонка бацькі ў адносінах да яго дзяцей ад папярэдняга шлюбу |
| пасынак | Няродны сын для мужа ці жонкі ў сям'і |
| падчарыца | Няродная дачка мужа ці жонкі |

*За кожнае правільнае вызначэнне някроўнага сваяка – 0,5 бала, за кожную прынцыпова правільную фармулёўку значэння – 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| *Памылка* | *Выпраўлены варыянт* | *Тлумачэнне* |
|---|---|---|
| Як пераканаўся Усяслаў, кавалямі сапраўды тварыліся цуды з жалеза і сталі, карыстаючыся кузнечнымі горнамі з мяхамі для паддуву паветра, накавальнямі, молатамі і малаткамі, кляшчамі і зубіламі, бародкамі і напільнікамі. | Як пераканаўся Усяслаў, кавалі сапраўды тварылі цуды з жалеза і сталі, карыстаючыся кузнечнымі горнамі з мяхамі для паддуву паветра, накавальнямі, молатамі і малаткамі, кляшчамі і зубіламі, бародкамі і напільнікамі. | Няправільна ўжыты дзеепрыслоўны зварот (дзеянне дзеепрыслоўя і дзеяслова-выказніка мае розных утваральнікаў). |
| Выробленая зброя ў кузнях | Выробленая ў кузнях зброя | Дзеепрыметнікавы зварот разрываць нельга |
| …седляроў, якія не толькі выраблялі надзейныя сёдлы для баявых коней, але і збрую для дружыны князя | …седляроў, якія выраблялі не толькі надзейныя сёдлы для баявых коней, але і збрую для дружыны князя | Састаўны злучнік *не толькі…, але і…* звязвае аднародныя члены сказа. Гэта значыць, што першая частка злучніка павінна стаяць непасрэдна перад першым аднародным членам, другая, адпаведна, перад другім. У прыведзеным прыкладзе першая частка злучніка *не толькі…* аддалена ад аднароднага члена сказа выказнікам *выраблялі*. |
| Усяслаў сфарміраваў сталыя гарнізоны дзеля аховы гарадоў, кіраўнікамі якіх прызначыў правераных у бітвах дружыннікаў. | Дзеля аховы гарадоў Усяслаў сфарміраваў сталыя гарнізоны, кіраўнікамі якіх прызначыў правераных у бітвах дружыннікаў. | Даданая азначальная частка павінна стаяць пасля слова, да якога яна адносіцца. |
| на тры асноўных аддзела | на тры асноўныя аддзелы | Памылка ў дапасаванні: лічэбнікі *два, тры чатыры* і састаўныя колькасныя, якія заканчваюцца на *два, тры, чатыры*, дапасуюцца да назоўнікаў ва ўсіх склонавых формах (у нашым выпадку павінна быць форма вінавальнага склону назоўніка і, адпаведна, лічэбніка. |

| | | |
|---|---|---|
| Стралкі-лучнікі ахоўвалі і стрымлівалі першыя атакі ворага | Стралкі-лучнікі ахоўвалі князя (людзей, горад) і стрымлівалі першыя атакі ворага. | Слова *ахоўвалі* патрабуе абавязковага ўдакладнення. Пры аднародных членах сказа *ахоўвалі і стрымлівалі* залежнае ад другога слова (*атакі*) да першага зусім не адносіцца. |

*За кожную дакладна вызначаную памылку і правільнае яе выпраўленне – па 0,25 бала, за правільнае тлумачэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| ***Дзеяслоў*** | ***Спра-жэнне*** | ***Інфінітыў*** | ***Дзеяслоў у форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу (з абавязковай пастаноўкай націску)*** | ***Дзеепрыслоўе*** |
|---|---|---|---|---|
| ***Апрабоўваліся*** | I | Апрабоўвацца | Апрабóўваеце | Апрабоўваючыся |
| ***Прызначыў*** | II | Прызначыць | Прызнáчыце | Прызначыўшы |
| ***Правёў*** | I | Правесці | Праведзяцé | Правёўшы |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

| ***№ п.п.*** | ***Прымета*** | ***Правільна*** |
|---|---|---|
| **1** | Словы *абарона, абарот, абараць, абарачэнне* маюць аднолькавы прэфікс. | |
| **2** | Слова ***эгіда*** з'яўляецца сінонімам да слова *абарона* і мае стылістычную памету ***спец.*** | |
| **3** | Уваходзіць у сінанімічны рад *ахова, заступніцтва, пратэктарат, захаванне.* | + |
| **4** | Прыказка ***Благая тая птушка, што свайго гнязда не бароніць*** мае значэнне: *не абавязкова абараняць свой дом.* | |
| **5** | У сказе *Выробленая зброя ў кузнях, сродкі* ***абароны*** *і ўся амуніцыя паступалі ў княжацкае войска...* вылучанае слова ўваходзіць у склад устойлівага спалучэння *сродкі абароны* і выконвае ролю дзейніка. | + |
| **6** | Утворана ад слова ***абараніць*** суфіксальным спосабам. | + |

*За кожны дакладны адказ (вызначэнне правільнасці /няправільнасці) – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

З усіх бакоў білі гарматы дробных калібраў, сярэдніх, калібраў буйнейшых, нарэшце, буйных, вельмі буйных, самых буйных, а часам і звышмагутныя гарматы, якія ледзь чутна бухалі глыбока ў тыле і раптам з нечаканым выццём, скрыгатам скідалі свае каласальныя снарады ў які-небудзь на выгляд *(з выгляду)* нявінны лясок. Часам аднекуль, з нечаканага боку, урываўся асколак, з сілай ударяўся ў зямлю, рабіў рыкашэт, кружыўся *(круціўся)*, трашчаў, звінеў, ныў, як ваўчок, і з агідным стогнам нёсся *(імчаў, імчаўся, ляцеў, адлятаў)* прэч, збіваючы на шляху *(мімалётам)* з дрэў галіны і шышкі.

*За кожную лексічную або граматычную памылку рэкамендуецца здымаць 0,5 бала, за арфаграфічную або пунктуацыйную – 0,25 бала.*

**Заданне 8.**

| *Ілюстрацыя* | *Нумар тэрміна і паняцця* | *Тэрмін і паняцце* |
|---|---|---|
| **А** | **2** | **партрэт** |
| **Б** | **1** | **класіцызм** |
| **В** | **3** | **трагедыя** |
| **Г** | **4** | **сімвал** |
| **Д** | **6** | **батлейка** |
| **Е** | **5** | **дэталь / мастацкая дэталь** |

*За кожнае правільнае вызначэнне тэрміна (паняцця) – 0,5 бала, за правільнае суаднясенне з ілюстрацыяй – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| *Янка Купала* | | *Якуб Колас* | | *Не адносіцца да жыцця і творчасці ні Янкі Купалы, ні Якуба Коласа* |
|---|---|---|---|---|
| *праўдзівы* | *памылковы* | *праўдзівы* | *памылковы* | |
| **2, 7** | **6** | **4** | **1** | **3, 5** |

*За кожнае правільнае суаднясенне (несуаднясенне) з жыццём і творчасцю Янкі Купалы ці Якуба Коласа – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці/памылковасці фактаў з жыцця і з творчасці песняроў – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Выкананне задання ацэньваецца па частках А, Б, В, Г. Максімальны бал за часткі А, Г – 1, за часткі Б, В – 2. Максімальная колькасць балаў за выкананне задання – 6.*

*Частка А.*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| *1* | *Дадзена лагічнае і абгрунтаванае тлумачэнне. Указана, што творы Янкі Брыля “Memento mori” і Міхася Лынькова “Васількі” не з’яўляюцца паэтычнымі.* |
| *0,5* | *Дадзена лагічнае і абгрунтаванае тлумачэнне. Указаны толькі адзін твор, які памылкова аднесены да паэтычных.*<br>*АБО*<br>*Указаны два творы, якія памылкова аднесены да паэтычных. Маюцца памылкі і недахопы ў абгрунтаванні.* |
| *0* | *Дадзена лагічнае і абгрунтаванае тлумачэнне. Не ўказаны творы, якія памылкова аднесены да паэтычных.*<br>*АБО*<br>*Тлумачэнне нелагічнае, неабгрунтаванае.*<br>*АБО*<br>*Абгрунтаванне адсутнічае.* |

*Частка Б*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| 2 | *Прапанаваны назвы, якія істотна адрозніваюцца ад выбранага тэматычнага прынцыпу, і дадзена лагічнае абгрунтаванне іх. Напрыклад, зроблены акцэнт на ідэйным прынцыпе (“Боль і страх, які нясе вайна”), аўтарстве (“Мужчынскі і жаночы погляд на вайну”) або героях (“Дарослыя і дзеці на вайне”).* |
| 1 | *Прапанавана адна назва, якая адрозніваецца ад выбранага тэматычнага прынцыпу, і дадзена лагічнае яе абгрунтаванне. Другая назва прапанавана паводле тэматычнага прынцыпу.*<br>*АБО*<br>*Прапанаваны дзве назвы, якія істотна адрозніваюцца ад выбранага тэматычнага прынцыпу, але для аднаго ці абодвух зборнікаў дадзена нелагічнае абгрунтаванне ці яно адсутнічае.* |
| 0 | *Прапанаваны назвы паводле толькі тэматычнага прынцыпу.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае.* |

*Частка В*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| 2 | *Прапанаваны па два прыклады, якія поўнасцю адпавядаюць выбранаму прынцыпу і ўмове задання.* |
| 1 | *Сярод прыведзеных прыкладаў ёсць тыя, якія поўнасцю адпавядаюць выбранаму прынцыпу і ўмове задання, і тыя, якія адпавядаюць не ў поўнай меры або цалкам не адпавядаюць.* |
| 0 | *Прапанаваны прыклады, якія не адпавядаюць выбранаму прынцыпу і/або ўмове задання.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае.* |

*Частка Г*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| 1 | *Выбрана карціна Міхаіла Савіцкага. Сярод аргументаў указваецца адпаведнасць зместу твораў і сюжэта карціны па часе, месцы падзей.* |
| 0,5 | *Выбрана іншая карціна, але дадзена праўдападобнае, лагічнае абгрунтаванне.*<br>*АБО*<br>*Выбрана карціна Міхаіла Савіцкага, але маюцца парушэнні ў логіцы абгрунтавання.* |
| 0 | *Выбрана іншая карціна, маюцца парушэнні ў логіцы абгрунтавання.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае.* |